дэмії музыкі трыа баяністаў В.Пісарчык – Г.Мандрус – Т.Брагінец, дуэт цымбалістак: Кавалеуская і В.Мішула і г.д. Спіс можна было б працягваць далей.

Развіццё ансамбляў народных інструментаў ідзе ў дзвюх асноўных напрамках: фальклорны і акадэмічны.

Ансамблі фальклорнага напрамку вывучаюць творчасць народа, традыцыйныя формы і жанры нацыянальнай музычнай культуры.

Ансамблі рэканструяваных (удасканаленых) народных інструментаў, асноўны напрамак іх дзейнасці – прапаганда твораў, што пішуцца кампазітарамі спецыяльна для падобнага роду ансамбляў на аснове народнай музыкі, перакладанне твораў кампазітараў розных эпох і нацыянальнасцей.

На Беларусі распаўсюджаны больш ансамблі змешанага саставу, якія ўключаюць як агульнараспаўсюджаныя інструменты, так і нацыянальна-этнаграфічныя.

Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да ўсё больш разнастайнага выкарыстання народных музычных інструментаў калектывамі самых розных творчых напрамкаў.

Кіраўнікі ансамбляў самі робяць шмат аранжыровак народных мелодый, перакладаў розных твораў, апрацоўваюць мясцовы фальклор, маюць цесныя сувязі з беларускімі кампазітарамі. Для многіх калектываў сення характэрна спалучэнне інструментальнай музыкі са спевамі, танцам, сцэнічным рухам, гэта значыць сінтэз шматжанравага мастацтва.

У выніку можна адзначыць разнастайнае праяўленне музычна-выканаўчага майстэрства ансамбляў народных інструментаў.

## СУЧАСНАЯ СТАНОВІШЧА І ПОГЛЯД НА БУДУЧЫНЮ Ў РАЗВІЦЦІ САМАДЗЕЙНЫХ (АМАТАРСКІХ) ДУХАВЫХ АРКЕСТРАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Ф.В.Юрцэвіч

Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь адлюстроўваецца ва усіх галінах чалавечай дзейнасці. Перш за ўсё адчуваецца гэта ў сістэме адукацыі, культуры і навукі. Алеж, сістэма мастац-

кай самадзейнасці, якая заўседы мацавалася за кошт сродкаў буйных прадпрыемстваў і іх прафсаюзаў, зараз бадай, апынулася на самай ніжэйшай ступени свайго існавання.

Духавыя аркестры, якія раней карысталіся больш-меньш лепшай павагай у кіраўнікоў прадпрыемстваў, таксама апынуліся ў цяжкім стане.

Зараз дырэктарам прадпрыемстваў непатрэбна займацца ўціраннем акуляраў высокаму начальству шыхуючыся, да правядзення розных камуністычных святкаванняў ды шэсцяў, дзе лічылася - раз буйны завод на дэманстрацыйным шэсці ідзе без духавога аркестра, дык гэта дрэнны завод, а зразумела, і дрэннае яго кіраўніцтва. Вось і спаборнічалі адзін перад адным: хто пакажа на дэманстрацыі большы аркестр, ды хто лепшы па якасці гучання. Справа дайшла да таго, што апошніх 10-15 гадоў запрашалі ў такія аркестры музыкантаў - прафесіяналаў з вельмі добрымі па тым часе разавымі стаўкамі. У сямідзесятыя гады разавая стаўка запрошанага музыканта была дзесяць рублей, а ў васьмідзесятыя, гэтая стаўка ўжо абыходзілася прадпрыемствам ад 25 да 50 рублей.

У гэтым спаборніцтве паміж кіраўнікамі прадпрыемстваў здарылася як у той рускай прыказцы: "Нет худа без добра", вынікам якога стаў рост мастацкага ўзроўня духавых аркестраў і іх колькасці. Так, у 1977 годзе ў сістэме Белсаўпрофа налічвалася 226 аркестраў у якіх удзельнічала 4665 музыкантаў-аматараў, і ўжо ў 1980 годзе колькасць аркестраў павялічылася да 313 з агульнай лічбай удзельнікаў 5722 чалавекі.

Значна была пашырана сетка духавых аркестраў і ў сістэме прафтэхадукацыі. Толькі ў тэхнічных вучылішчах г.Мінска дзейнічала 13 духавых аркестраў з колькасцю удзельнікаў 224 чалавекі.

Па ведамственным установам Міністэрства культуры у 1970 годзе налічвалася 310 самадзейных духавых аркестраў (4417 удзельнікаў), а ў 1978 годзе 336 калектываў з лічбай ужо ў 5276 удзельнікаў.

Якое ж становішча духавых аркестраў на сённяшні дзень?

З васьмі аркестраў г.Мінска, якія маюць ганаровае званне "народны", засталося сем калектываў. Не існуе больш аркестра ПА імя Леніна. З 19 аркестраў другіх прадпрыемстваў г.Мінска засталося каля дзесяці калектываў. Не існуюць больш аркестры на прадпрыемствах: Белэлектрамантаж, ПА мясцовай прамысловас



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці, мотавелазавода, ПК Мінскпрамстрой, завода імя Казлова і інш.

Тыя ж аркестры, якія лічацца дзеючымі, на самой справе страцілі большасць сваіх удзельнікаў, а некаторыя, нават, не маюць памяшканняў для рэпетыцыі.

Такое становішча духавых аркестраў сведчыць аб тым, што эра самадзейнай мастацкай творчасці, лічачы па сучасным абставінам, хутчэй за ўсе пойдзе па накірунку заходне-еўрапейскіх краін.

Як вядома, жыццё знойдзе свае выйсце. Замест "самадзейных" хутчэй за ўсе з'явяцца "аматарскія" калектывы. Людзі будуць самі аб'ядноўвацца па інтарэсах, наймаць кіраўнікоў калектываў, арэндаваць памяшканні для заняткаў і г.д.

Дакладчыку давялося асабіста прысутнічаць у Галандыі на конкурсе духавых аматарскіх аркестраў. Уражанне вельмі цікавае і каштоўнае. У параўнанні з нашымі самадзейнымі аркестрамі іх аматарскія аркестры меньшыя па саставу, больш разнастайныя па ўзросту выканаўцаў (ад 15-16 да 60-70 гадоў); больш оціплыя па выканаўчай праграме. Яны не бяруцца за буйныя, цяжкія творы, а, наадварот, у асноўным песенна-страевы рэпертуар, але ж у вельмі добрым выкананні. Усе удзельнікі прыехалі на конкурс за свой кошт. Арганізацыйны камітэт конкурсу дапамог ім толькі з уладкаваннем жылля і харчу. У выніку свята было для ўсіх, і аматараў-музыкантаў і слухачоў-гараджан.

## СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ СВЯДОМАСЦІ МУЗЫКАНТА У ПРАЦЭСЕ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ

А.А.Царова

Даследванне творчай сістэмы выканаўца вызначае шэраг пытанняў, вырашэнне якіх можа даць значны імпульс да удасканальвання працэса яго прафесійнай адукацыі. У гэтых адносінах істотнае псіхалагічнае вымярэнне будуць мець тыя фактары сістэмы, якія утвараюць эфект стымулаў да узнікнення свядомай дзейнасці з вызначаным напрамкам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ